# [Крытычнаяататка пра тэатральную дыскусію, распачатую Т. Глыбоцкім]

«Зачым, ныні, чужыя аб'едкі, калі мы можам стварыць свае, уласныя, хатнія, свае гадоўлі? Нашто тэатр рабіць „інтэрнацыян[альным]“ рукамі Івановых, калі ён можа гэта–ж самае зрабіць нашымі рукамі; хай будуць яны горшыя, але–ж свае», — вось існасьц[ь] выст[упленьня] Глыбоцкага. Відаць, „свае“ без работы, ці што? Здаволіліся, мусіць, з літаратуры, давай ім цяпер тэатр. Эклектыкі!

---

1. Глыбоцкі дзейнічае (выступае) не самастойна, а зьяўляецца органам у трэціх руках, якія жадаюць зьмяніць кіраўніцтва тэатру. Дзеля гэтага прыцягваюцца за вушы розныя туманныя тэорыі і да т. п.
2. Жылуновіч выступае як абаронца Глыбоцкага, яго староньнік, т[акім] ч[ынам] маскуючы, што той, каго ён абараняе, ёсьць толькі рупар абаронцы. Ён таксама выстаўляе тэорыі, што тлумачаць труднасьці і перашкоды, якія становяцца на шляху да ажыцьц[яўленьня] паст[аўленай] мэты (зьмены кіраўніцтва), „старой пагудкай на новы лад“.
3. З другога боку стаў Мірончак і Баліцкі, якія ўгледзелі правы ўхіл у першых, г. зн. фактычна ў дамаганьні зьмены тэатр[альнага] кіраўніцтва. Па іх выходзіць, што гэтая зьмена пакуль што не патрэбна, усё, на іх думку, стаіць добра.

Выходзіць, што тыя мала высунулі аргумэнтаў за зьмену кіраўніцтва. Яны выставілі ўсяго фактычна адзін, менавіта, што суч[аснае] кір[аўніцтва] вядзе тэатр па шляху пераймальня ад расейскага тэатру, што робіць яго фактычна расейскім тэатрам у беларускай мове, або ў беларускіх умовах. Тэатр, на іх думку, зьяўляецца праваднікам не бел[арускай], а расейскай культуры на Беларусі пад шыльдаю пролетарскай культуры (ён не дае расейскіх дасягнень[няў] у сваёй апэрцэпцыі, а проста перасаджвае з Масквы ў Менск).

Цікавае зьявішча! Тое, што гэтыя літаратары (Глыб[оцкі] асабліва) робяць самі ў літаратуры і выстаўляюць як заслугу сваю, тое–ж акурат яны лічаць заганаю, калі яго робіць тэатр. Ці ня ёсьць гэта выяўленьне ўсё той–жа прагнасьці на монаполію, за якую ваявалі яны і былі пабіты летась? Чытаеш іх, і выходзіць, што вось яны толькі прававерныя, што яны толькі прызваны рабіць перасадку. Усё што не ад іх, то ад лук[авага].

*[1928]*